УДК 808.26–22

***А. В. Солахаў***

# СУФІКСАЛЬНА-ПОСТФІКСАЛЬНЫ СПОСАБ УТВАРЭННЯ ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ ДЗЕЯСЛОВАЎ У МОВЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

*У артыкуле на аснове багатага фактычнага матэрыялу (76 слоў) з тэкстаў сучаснай беларускай паэзіі аналізуюцца структурна-семантычныя групы індывідуальна-аўтарскіх дзеясловаў, утвораных суфіксальна-постфіксальным спосабам, паказваецца іх прадуктыўнасць, адзначаюцца змены, што адбыліся ва ўтваральнай аснове ўтвораных дзеясловаў.*

## Уводзіны

Утварэнне дзеясловаў у сучаснай беларускай мове адбываецца рознымі спосабамі – прыставачным, суфіксальным, прыставачна-суфіксальным, а таксама спосабамі, якія ўжываюцца толькі пры дзеяслоўнай дэрывацыі. Адзін з такіх спосабаў – суфіксальна-постфіксальны, пры якім новыя словы ўтвараюцца шляхам далучэння да ўтваральных асноў фарманта, у склад якога ўваходзяць суфікс і постфікс. У сучаснай беларускай мове, побач з іншымі, выкарыстоўваюцца фарманты *-і-цца*, радзей *-е-цца*, *-ава-цца*. Некаторай прадуктыўнасцю вызначаюцца толькі адпрыметнікавыя дзеясловы з фармантам *-і-цца* тыпу *высіцца*, *дзічыцца*, *скупіцца*, *кучаравіцца*, *весяліцца*. Іншыя тыпы малапрадуктыўныя або непрадуктыўныя [1, 340–341], [2, 236]. «Суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы нешматлікія, – падкрэслівае Л. А. Антанюк, – маюць пэўную прадуктыўнасць пераважна ў сельскагаспадарчай тэрміналогіі…» [3, 339]. Дэрываты з фармантам *-ава-цца* не складаюць асобнага тыпу, таму што маюць living словаўтваральнае значэнне [1, 341].

Нізкай прадуктыўнасцю вызначаюцца індывідуальна-аўтарскія суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы ў мове беларускіх мастацкіх твораў 20-х гадоў XX ст. М. Шабовіч, які даследаваў словаўтваральныя асаблівасці індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў таго перыяду, зафіксаваў 15 суфіксальна-постфіксальных дзеяслоўных дэрыватаў: *балоціцца, барвяніцца, бахмаціцца, брыльянціцца, жвірыцца, каляравацца, крушыніцца, кудрыцца, люстравацца, люстраніцца, махнаціцца, паветрыцца, прыгоршчыцца, русаліцца, чароціцца*. Тры з іх *(люстравацца, барвяніцца, махнаціцца)* папоўнілі слоўнік літаратурнай мовы [4, 86–87].

Пры аналізе суфіксальных дзеяслоўных утварэнняў у тэкстах мастацкай літаратуры XX ст. М. С. Васілеўскі разглядае таксама суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы [5]. Сярод іх, напрыклад, адзначаюцца: *калдобіцца, каршэніцца, дунаіцца, смужыцца, азёрыцца, грывіцца, муравіцца, ручаіцца, ляноціцца* [5, 154–172].

Асобнага даследавання, прысвечанага ўтварэнню суфіксальна-постфіксальных дзеясловаў, у беларускім мовазнаўстве яшчэ, аднак, не праводзілася.

Таму ў гэтым артыкуле на багатым фактычным матэрыяле з мовы сучаснай беларускай паэзіі аналізуюцца асаблівасці ўтварэння індывідуальна-аўтарскіх суфіксальна-постфіксальных дзеясловаў, вызначаюцца іх структурныя і семантычныя асаблівасці.

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Даследаванне мовы сучаснай беларускай паэзіі паказвае, што індывідуальна-аўтарскія суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы складаюць вялікую групу аказіянальнай лексікі. Самымі пашыранымі суфіксальна-постфіксальнымі дзеяслоўнымі ўтварэннямі з'яўляюцца дэрываты з фармантам *-і-цца (-ы-цца)*, якія матывуюцца назоўнікамі і прыметнікамі.

Найбольш прадуктыўную групу сярод іх складаюць дэрываты, якія паходзяць ад асноў назоўнікаў. Паводле словаўтваральнага значэння яны падзяляюцца на некалькі словаўтваральных тыпаў:

МГПУ им. И.П.Шамякина

1) ‘ажыццяўляць дзеянні, уласцівыя таму, хто названы або што названа ўтваральнай асновай’. Аказіянальныя суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы з гэтым значэннем утвараюцца ад назоўнікаў, якія абазначаюць асоб, жывёл, насякомых, і падзяляюцца ў залежнасці ад прыватнага значэння на наступныя падтыпы:

а) ‘праяўляць рысы таго, хто названы ўтваральнай асновай назоўніка’: ***дзеўчыцца*** ‘праяўляць рысы дзяўчыны (дзеўкі)’: *Жанаты я, / Заняты сам сабою. / Дачцэ ўжо* ***дзеўчыцца*** */ Вясной любою* (Р. Барадулін); *Не абхітрыць яе / І сатана. / Бач, з-за спіны выглядае. / Ты аціншэў, астарэў, / А яна /* ***Дзеўчыцца****, бо маладая!* (Р. Барадулін); ***рабыніцца*** ‘праяўляць рысы рабыні’: *Перад кім душой мы* ***рабынімся****, / Дэцыбелаў сцяной адгароджаныя?* (В. Зуёнак); ***славяніцца*** ‘праяўляць рысы славян’: *Вышэй ухвал, / Вышэй абраз / Світае твар нятленна – / Аблічча / Ці святы абраз? – /* ***Славяніцца****: / Алена* (Р. Барадулін);

б) ‘паводзіць сябе пэўным чынам, быць тым або падобным на таго, каго называе ўтваральная аснова назоўніка’: ***воўчыцца*** ‘быць падобным на ваўка’: *...Чаму сабаку* ***«воўчыцца»*** *не варта / Перад старым канём на сенажаці...* (Н. Гілевіч); ***караліцца*** ‘паводзіць сябе, як кароль; быць падобным на караля’: *Ралько прыйшоў ад араллі, / На ніве караніўся, / На ніве* ***караліўся*** (К. Камейша); ***снягурыцца*** ‘быць падобным на снягурку’: *Завейнай памяці сцяжкі, / Ад халадоў уратаванне – / Гараць у Мінску кажушкі, /* ***Снягурацца*** *на скрыжаваннях* (В. Зуёнак);

в) ‘утвараць тое, што ўласціва жывым істотам, названым утваральнай асновай назоўніка’: ***блазніцца*** ‘ўтвараць тое, што ўласціва блазну’: *Вятрэц* ***блазніўся****, каб аб ім / Падумалі як аб вар’яце* (Р. Барадулін); ***ведзьміцца*** ‘ўтвараць тое, што ўласціва ведзьме’: *У выдмах захмарных / Завея* ***ведзьміцца*** (Р. Барадулін); ***сіроціцца*** ‘ўтвараць тое, што ўласціва сіраце’: *Уратаваны скарб грудком /* ***Сіроціўся*** *на ўзмежку, / І комін між былых куткоў / Глядзеў на галавешкі…* (В. Зуёнак);

г) ‘множыцца тым, каго называе ўтваральная аснова назоўніка’: ***камарыцца*** ‘множыцца камарамі’: *Пакуль мой край балотна* ***камары****ўся / І лапатная слава йшла пра нас, / Пакуль булён будзённых спраў варыўся / І я сваёй сталіцай ганарыўся, / Мяне ў свой вір зацягвала яна* (К. Камейша); ***нашчадзіцца*** ‘множыцца нашчадкамі’: *Тры прыступкі. /* ***Нашчадзьцеся****, унукі, неадступна ступайце далей* (Р. Барадулін);

д) ‘утвараць дзеянне, якое пэўным чынам звязана з тым, хто названы ўтваральнай асновай’: ***гайдарыцца*** ‘утвараць дзеянне, якое пэўным чынам звязана з Гайдарам (Ягор Цімуравіч Гайдар – расійскі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, эканаміст, адзін з ініцыятараў рэфармавання расійскай эканомікі)’: *І экран на ўсе тэлеабдоймішчы / Прэ ў народ і ўзахліпкі* ***гайдарыцца****. / А ў народа – сталае відовішча: / У чарзе, як у пятлі, гайдаецца* (В. Зуёнак);

е) ‘станавіцца падобным на тое, чым становяцца ў выніку работы таго, хто названы асновай назоўніка’: ***ювелірыцца*** ‘быць падобным на прадмет, зроблены ювелірам’: *Паглядзіце: на вербах, па-зімняму ніцых, / Сонца робіць работу, забыўшы спачын: / Каташкі* ***ювеліравацца*** *на завушніцы / На ружовыя мочкі харошых жанчын* (У. Верамейчык).

У гэтым тыпе 13 словатвораў. Утваральнымі выступаюць асновы двухскладовыя (8), аднаскладовыя (3) і трохскладовыя (2). Некаторыя ўтваральныя асновы захоўваюцца ў аснове дзеясловаў у нязменным выглядзе: *рабыня – рабыніцца, камар – камарыцца, Гайдар – гайдарыцца, ювелір – ювелірыцца.* У большасці дзеясловаў на марфемным шве ўтваральнай асновы і суфікса дзеяслова адбываецца чаргаванне зычных: *н–н’ (блазен – блазніцца, славянка – славяніцца), к–ч: (воўк – воўчыцца, дзеўка – дзеўчыцца), д–дз’ (нашчадак – нашчадзіцца), м–м’ (ведзьма – ведзьміцца), т–ц’ (сірата – сіроціцца).* У асновах таксама адзначаецца альтэрнацыя галосных: *о–а (кароль – караліцца), а–о (сірата – сіроціцца).* Скарачэнне ўтваральнай асновы адбылося ў трох выпадках: *нашчад/ак/ – нашчадзіцца, славян/к/а – славяніцца, снягур/к/а – снягурыцца.* Націск на ўтваральнай аснове;

2) ‘ажыццяўляць дзеянні, уласцівыя таму, што называе ўтваральная аснова назоўніка’. Аказіянальныя суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы з гэтым значэннем утвараюцца ад назоўнікаў, якія абазначаюць канкрэтныя прадметы, з’явы прыроды, зборныя і адцягненыя паняцці, і падзяляюцца ў залежнасці ад прыватнага значэння на наступныя падтыпы:

а) ‘праяўляць уласцівасці таго або станавіцца (быць) падобным на тое, што называе ўтваральная аснова назоўніка’: ***асеніцца*** ‘праяўляць уласцівасці восені’: *Мой дзень* ***асеніцца*** *ў журбе. / Ліст зжоўклы – ў забыццё білет* (Р. Барадулін); ***букеціцца*** ‘станавіцца (быць)

МГПУ имени И.П.Шамякина

падобным на букет’: *А піва* ***букеціцца*** *пенна, / Не піва, а казка адна* (К. Камейша); ***буруніцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на буруны’: ***Буруняцца*** *жоўтыя хвалі Янцзы* (В. Лукша); ***бярвеніцца*** ‘праяўляць уласцівасці бярвёнаў’: *У лёс раскладзены гады / І памяццю* ***бярвеняцца****...* (М. Касцюкевіч); ***вечарыцца*** ‘праяўляць уласцівасці вечара’: *Тут сад шумеў, цвілі лугі, / Гуляла мора хваляй пеннай. / Усё, што днела на зямлі, / Тут* ***вечарылася*** *падземна* (К. Камейша); ***вярбіцца*** ‘праяўляць уласцівасці вярбы’: *Журбе /* ***Вярбіцца*** *ніца* (Р. Барадулін); ***ігліцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на іглы’: *На мосціку тоўпіцца ранак, / А там, дзе* ***ігліцца*** *вада, / Крыжанак, ныркоў і чыранак / Плыве да людзей чарада* (В. Лужкоўскі); ***калдобіцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на калдобіну’: *Зноў памяці вецер* ***калдобіцца*** *пылам / Гаркавы, тужлівы і лёгка ўзгушканы...* (І. Рубін); ***каруніцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на карункі’: *Святкуе зноў мая душа, / Да Нёмана кіруецца. / Пайшла ў Лядзінах чарамша, / На сонцы аж* ***каруніцца*** (К. Камейша); ***кіпцюрыцца*** ‘праяўляць уласцівасці кіпцюроў’: *З Усходу – серп, каса расейская, / А з Захаду –* ***кіпцюрыцца*** *арол...* (Я. Хвалей); ***кубеліцца*** ‘праяўляць уласцівасці кубла’: ***Кубеліцца*** *святая прастата / Пад рэчышчам, пад хваляю, пад пенай, / Пад вечнасцю апошняга пласта, / Што ў мроі нараджаецца / імгненнай* (Г. Булыка); ***куліцца*** ‘праяўляць уласцівасці куля’: *А на млыны* ***куліўся*** */ Коўш зорны з-за сяла* (Р. Барадулін); ***Куліцца*** *пад адхон / Яшчэ не час калёсам.* (Р. Барадулін); ***ледзіцца*** ‘праяўляць уласцівасці лёду’: *У студні памяці / Вада ўспамінаў* ***ледзіцца*** (Р. Барадулін); ***промніцца*** ‘праяўляць уласцівасці промняў’: *І* ***промніцца*** *над колам рук: / Бяссмертны ты, і я не ўмру* (Н. Мацяш); ***пыжыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на пыж’: ***Пыжыцца*** *зацята амяла, / Тайныя франты яе – тылы: / Не відно, як смокчуць са ствала / Сок чужы прысоскі амялы* (В. Зуёнак); ***ружыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на ружу’: *Над вячэрняю ваколіцай / Ціха* ***ружыцца*** *зара* (В. Лужкоўскі); *А зара над лугам* ***ружыцца,*** */ Халадочак ад ракі* (В. Лужкоўскі); *Ружавыя кветкі* ***ружацца*** *вясною* (В. Аколава); ***рэбрыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на рэбры’: *Мы, як апошнія ваўкі, / Пасляваеннікі-паэты. / Ужо настаўлены цвікі, / Каб шкуры нашыя з імпэтам – / Распяць на прыцемнай сцяне, / Дзе* ***рэбрацца*** *старыя бёрны* (Р. Барадулін); ***сузорыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на сузор’е; праяўляць уласцівасці сузор’яў’: ***Сузорыцца*** *кмен пад страхою* (Р. Барадулін); *Зязюльчын мох, / Ад брусніц* ***сузорся!*** (Р. Барадулін); ***сутоніцца*** ‘праяўляць уласцівасці сутоння’: ***Сутоніцца****, і лівень на двары / Панура, утрапёна ў шыбы плешча...* (Н. Мацяш); ***узорыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на ўзоры’: *Адчай з прарочымі вачыма, / Дзе* ***ўзорацца*** *шляхоў шлякі, / Дзе з небам раіцца Радзіма, / Дзе немагчымае магчыма, / Дзе дзівакуюць дзівакі* (Р. Барадулін); ***хмурыніцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на хмурыны’: *Хто сеткі навядзе? /* ***Хмурыняцца*** *шматкі. / І чайкі на вадзе – / Адчаю паплаўкі…* (Р. Барадулін); ***чынарыцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на чынару’: *Ты* ***чынарышся,*** */ Ўзбечка. / Я зірну – / І ўздыхну: / Твой пагляд, / Як вуздэчка / Юнаму скакуну* (Р. Барадулін); ***шчаціцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на шчэць’: *Я іду на пагорак, прапахлы ржаною саломай, дзе* ***шчаціцца*** *здзічэла мядзяным іржэўнікам дол...* (Г. Пашкоў); ***шчэціцца*** ‘станавіцца (быць) падобным на шчэць’: *Пад яблынямі* ***шчэціцца*** *трава...* (М. Мятліцкі); ***ядрыцца*** ‘праяўляць уласцівасці ядра’: *Маланкі стынуць у траве. / Ад сонца* ***ядрацца*** *дажджыны* (Г. Пашкоў).

б) ‘пакрывацца, насычацца, множыцца тым, што называе ўтваральная аснова назоўніка’: ***весціцца*** ‘множыцца весткамі’: *Часу зноў берагі / Развясловаены шырай – / Слоў тых* ***весціцца*** *вырай* (І. Рубін); ***ігліцца*** ‘пакрывацца іголкамі’: *Жыгучка-крапіва казыча, /* ***Ігліцца*** *дзядоўнік густы, / Бо мы – па законах тактычных – / Паўз рэчку ідзём, праз кусты* (В. Зуёнак); ***кастрыцца*** ‘множыцца кастрыцай’: *У двары кастрыца – / Час прыйшоў* ***кастрыцца*** (А. Шушко); ***лісціцца*** ‘множыцца лісцем’: *Нам не чуваць, калі вясна* ***лісціцца****, забылі мы пра восень і зіму* (К. Камейша);

в) ‘віднецца тым, што называе ўтваральная аснова’: ***калёрыцца*** ‘віднецца колерамі’: *І каруселлю пад прытуп /* ***Калёрацца*** *спадніцы* (А. Шушко); ***раменіцца*** ‘віднецца рамянём’: *Пуза гладка* ***раменіцца*** *– з браўнінгам / Ці яшчэ з якой трасцай на ім* (В. Зуёнак);

г) ‘ужываць тое, што называе ўтваральная аснова’: ***жарціцца*** ‘ўжываць жарты’: *Вы знаеце, як* ***жарцяцца*** *з паэта; / Па-камароўску плёткі раздаюць?!* (В. Аколава);

д) ‘набываць адзнакі таго, што называе аснова назоўніка’: ***нядзеліцца*** ‘набываць адзнакі нядзелі’: *Прывід мары становіцца явай, / І* ***нядзеліцца*** *будні трыснёг / Ад табой зноў набытага права / Быць – каб сонцам валодаць, як Бог* (Н. Мацяш); *Бурштынова* ***нядзеляцца*** *соты, / Штось спявае руды меданос...* (К. Камейша);

МДПУ імя І.П.Шамякіна

е) ‘мець такі выгляд, як у месцы, названым утваральнай асновай назоўніка’: ***шанхаіцца*** ‘мець такі выгляд, як у Шанхаі’: *Вакол **шанхаяцца** баракі / З далёкіх выклятых часін* (В. Лужкоўскі); *Гудзела ноч у звоне чарак, / І хоць **шанхаяцца** дамкі, / Шырока слаліся цыгарак / У згодзе белыя дымкі* (В. Лужкоўскі);

ж) ‘рабіць тое, што выклікае ў людзей эмацыянальныя пачуцці, адпаведны настрой, душэўны стан’: ***аскоміцца*** ‘выклікаць аскому’: *А ўжо насмажаных брусніц / Не знойдзеш і на лекі – / Тых, што **аскомяцца** ля шчок, / Калі выходзіць з печы / Ўчарнелы ад агнёў гаршчок – / Найсамы знатны фельчар…* (В. Зуёнак); ***жалобіцца*** ‘выражаць жалобу’: *Што ўзяць сыны паспелі? / Ні хлеба, / Ні лайна. / Туман, / Сцялі пасцелі! / У галавах – Вайна. / Цяпер ляцець да іх, / Ды / Захмараны шляхі. / На хустцы ў Бянігны / **Жалобяцца** шлякі* (Р. Барадулін);

з) ‘падвяргацца таму, што называе аснова ўтваральнага назоўніка’: ***бяссмерціцца*** ‘падвяргацца бяссмерцю’: *Хай свіціцца рака, зоркі шчодра яснеюць, / І лясы не радзеюць, і падлескі шугаюць увысь, / І шпакі заліваюцца, ледзьве заднее, / І **бяссмерцяцца** стрэлкі зялёнай травы* (А. Салтук); ***дрымоціцца*** ‘падвяргацца таму, што падобна на дрымоту’: *Вераснёва **дрымоціцца** поле, вераснёва дымяцца кастры* (К. Камейша); ***жальбіцца*** ‘падвяргацца таму, што падобна на жальбу’: *А ельнік пасінеў, нібы азяб / На Лысагорскай выспе ветрагоністай. / І сонца – летняй талакі праараб – / У лістападнай **жальбіцца** агоніі* (В. Зуёнак); ***самоціцца*** ‘падвяргацца таму, што падобна на самоту’: ***Самоціцца*** *бярозка ля шашы* (З. Марозаў);

і) ‘праяўляць тое або праяўляцца тым, што называе суадносны назоўнік’: ***злабіцца*** ‘праяўляць злобу’: *Не **злабіся** на ерэтыкоў, / Не цягні ў самое неба выю. / Свет без іх – чародка прасцякоў, / Свет жывы – пакуль яны жывыя* (У. Караткевіч); ***спякоціцца*** ‘праяўляцца спякотай’: *Высокі поўдзень блаславіце, / Пакуль **спякоціцца** без краю* (К. Камейша);

к) ‘станавіцца тым, што называе аснова назоўніка’: ***рэшціцца*** ‘станавіцца рэштай’: *Калі трэшчынамі, нібы рэчышчамі, спярэшчваецца шчыт дрэва, гліны ці тынку, ён **«рэшціцца»** – робіцца рэштай сябе ранейшага* (А. Разанаў);

л) ‘ажыццяўляць дзеянне як вынік таго, што названа ўтваральнай асновай’: ***генезіцца*** ‘ажыццяўляць дзеянне як вынік генезісу’: *Той, хто раздумоўвае пра гняздо, разумее, што яно нараджаецца – **«генезіцца»** – з саміх птушак, з іхняй інтуіцыі, з іхняй існасці...* (А. Разанаў).

У гэтым словаўтваральным тыпе – 44 словатворы. Утваральныя асновы двухскладовыя (24), аднаскладовыя (18) і трохскладовыя (2). Яны з’яўляюцца назвамі прадметаў, рэчываў, адцягненых паняццяў. Асобныя ўтваральныя асновы захоўваюцца ў дзеяслоўных дэрыватах пераважна без змен: *бяссмерце – бяссмерціцца, весць – весціцца, вечар – вечарыцца, кіпцюр – кіпцюрыцца, куль – куліцца, лісце – лісціцца, нядзеля – нядзеліцца, пыж – пыжыцца, ружа – ружыцца, раменіцца – раменіцца, узор – узорыцца, чынара – чынарыцца, Шанхай – шанхаіцца, шчэць – шчэціцца, ядро – ядрыцца*. На марфемным шве ўтваральных асноў і суфікса чаргуюцца цвёрдыя і мяккія зычныя: *б–б’ (вярба – вярбіцца, жалоба – жалобіцца, жальба – жальбіцца, злаба – злабіцца), д–дз’ (лёд – ледзіцца), н–н’ (бервяно – бярвеніцца, бурун – буруніцца, карункі – каруніцца, промень – промніцца, хмурына – хмурыніцца), нн’–н’ (сутонне – сутоніцца), л–л’ (ігла – ігліцца, кубел – кубеліцца), м–м’ (аскома – аскоміцца), т–ц’ (букет – букеціцца, жарт – жарціцца, дрымота – дрымоціцца, самота – самоціцца, спякота – спякоціцца, рэшта – рэшціцца)*. Адзначаецца таксама чаргаванне галосных *э–а (бервяно – бярвеніцца, шчэць – шчаціцца), а–э (бервяно – бярвеніцца), о–а (колер – калёрыцца), э–о (колер – калёрыцца), о–э (лёд – ледзіцца)*. У 3-х утваральных асновах адбылося скарачэнне ўтваральнай асновы: *сузор’[/j/э] – сузорыцца, калдоб/ін/а – калдобіцца, генез/іс/ – генезіцца.* З накладаннем часткі фарманта *-ы-цца* на суфікс *-ыц* утвораны 1 індывідуальна-аўтарскі дзеяслоў: *кастрыца – кастрыцца.* Націск пераважна на ўтваральнай аснове, але ў некаторых выпадках, пераважна з аднаскладовых утваральных асноў, ён перамяшчаецца з асновы або з канчатка на суфікс: *ве́чар – вечары́цца, куль – кулі́цца, лі́сце – лісці́цца, вярба́ – вярбі́цца, злаба́ – злабі́цца, ігла́ – іглі́цца, шчэць – шчаці́цца.*

Ад асноў прыметнікаў індывідуальна-аўтарскія суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы ўтвараюцца пры дапамозе фарманта *-і-цца (-ы-цца)* па прадуктыўным у літаратурнай мове тыпе [1, 341]. Дэрываты набываюць значэнне ‘станавіцца (быць) такім, які названы ўтваральнай асновай прыметніка; праяўляць прымету, названую ўтваральнай асновай’: ***блакіціцца*** ‘станавіцца

МГПУ им. И.П.Шамякина

(быць) блакітным’: *З табой мне не цямнеецца, / Лёс на прамень надзееца, / Дзе свеціцца, **блакіціцца** / Зямлёй і небам жытніца.* (М. Баравік); ***важніцца*** ‘станавіцца (быць) важным, праяўляць важнасць’: *...**Важняцца** / І дражняцца / З кожнага: / – Поні, поні, пончыкі, / Піражкі, – / Не павезці вам ніколі / Воз цяжкі.* (В. Зуёнак); ***высакародзіцца*** ‘станавіцца (быць) высакародным, праяўляць высакароднасць’: *...І людзі, што мовы сваёй адцураліся, / Душой чужаземнаю **высакародзяцца**. / І гэтак штораніцы, гэтак штораніцы... / – О людцы, а з кім жа мне словам абродніцца?..* (В. Зуёнак); ***гасцініцца*** ‘станавіцца (быць) гасцінным, выражаць гасціннасць’: *Добразычлівасць не згіне – / Скрозь **гасціняцца** сталы: / У Малінаўцы – маліны, / Ў Сакалоўцы – сакалы.* (А. Пісьмянкоў); ***жвавіцца*** ‘праяўляць жвавасць’: *...На зялёных лугах, у гаях гуляла і **жвавілася** няпужаная зверына* (А. Разанаў); ***ласіцца*** ‘станавіцца (быць) ласым’: *Хай на славу ласыя **ласяцца**, / Хай хапаюцца за чубы: / Пра вяршыню пад назвай Класіка / Ім і ў страшным сне не забыць* (К. Жук); ***чуліцца*** ‘праяўляць чуласць’: *Як ні было б балюча ў скрусе, / Маліць і **чуліцца** не мне. / Не пахіснуся, не зламлюся, / Хоць лёс і громам секане* (К. Кірэенка); ***лубяніцца*** ‘рабіцца лубяным’: *...З плячэй бацькоўскіх кажушкі / Нашчадкам сталіся для ўцехі. / І **лубяніцца** шык і форс, / На вёсцы спісаны з ужытку, / Спартсмену грэе дужы торс / І два грудкі дзяўчыне плыткай.* (В. Зуёнак); ***мутніцца*** ‘станавіцца (быць) мутным’: *Сакавік – гэта **мутніцца** плынь...* (Г. Юрчанка); ***сыціцца*** ‘станавіцца (быць) сытым’: *Ад дармаедства ўся распуста: / Нішто душу не губіць так, / Як незаробленая луста, / Якою **сыціцца** лайдак.* (Н. Гілевіч); ***цьмяніцца*** ‘станавіцца (быць) цьмяным, праяўляць цьмянасць’: *На досвітку ўсё прамяніцца, / Пад вечар **цьмяніцца** скепліва.* (Р. Барадулін); ***цяжыцца*** ‘станавіцца (быць) цяжкім’: *Змрок васільковы, сцежка ў жыце. / Ціха паклаліся нанач сады, / Росы апалі. Колас **цяжыцца**. / Дзень у вачах – малады, малады.* (У. Лісіцын); ***яршыніцца*** ‘станавіцца (быць) яршыністым’: *І **яршыняцца** ў лузе атавы.* (Я. Янішчыц); ***ярыцца*** ‘станавіцца (быць) ярым’: *Цямніся, ноч! Світай, світанне! **Ярыся**, сонца! Днейся, дзень!* (Н. Гілевіч).

Словаўтваральны тып складаюць 14 дзеяслоўных дэрыватаў. Утваральныя асновы аднаскладовыя (9), двухскладовыя (3), трох- і чатырохскладовыя (па 1). У пяці ўтваральных асновах скарачаюцца суфіксы *-н-* і *-іст-* *(персаналь/н/ы – персаналіць, высакарод/н/ы – высакародзіцца, гасцін/н/ы – гасцініцца, цяж/к/і – цяжыцца, яршын/іст/ы – яршыніцца)*. На марфемным шве ўтваральнай асновы і суфікса *-і-* адбываецца чаргаванне цвёрдых і мяккіх зычных: *н–н’ (важны – важніцца, гасцінны – гасцініцца, лубяны – лубяніцца, мутны – мутніцца, цьмяны – цьмяніцца), т–ц’ (блакітны – блакіціцца, сыты – сыціцца), в–в’ (жвавы – жвавіцца), д–дз’ (высакародны – высакародзіцца), л–л’ (чулы – чуліцца), с–с’ (ласы – ласіцца).* Адна ўтваральная аснова – з канцавым *-р-* – без змен увайшла ў склад індывідуальна-аўтарскага дзеяслова *(яры – ярыцца)*. У дванаццаці дэрыватах націск застаецца на ўтваральнай аснове, у двух – з канчатка пераходзіць на аснову *(лубяны́ – лубя́ніцца, цяжкí –ця́жыцца)*.

Аказіянальныя суфіксальна-постфіксальныя дзеясловы, утвораныя пры дапамозе фарманта *-ава-цца*, маюць наступныя словаўтваральныя значэнні:

1) ‘выконвацца пры дапамозе таго, што называе ўтваральная аснова’: ***шаўкавацца*** ‘скручвацца ў ніткі з шоўку’: *Які там сум, / ...Калі шыкуюцца вяселлі, / Калі **шаўкуюцца** ніты, / Калі і ў восені / Вясенняй / Яшчэ так многа пекнаты* (К. Камейша);

2) ‘рабіць тое, што называе ўтваральная аснова’: ***медавацца*** ‘збіраць мёд’: *Пчала **мядуецца** рупліва...* (У. Лісіцын);

3) ‘падвяргацца таму, што названа ўтваральнай асновай’: ***мутавацца*** ‘падвяргацца мутацыі’: *...каму хамут ускладаецца на карак, той ужо не вольны ў сваіх паводзінах, той мяняецца, той **«мутуецца»**, праходзячы хуткі шлях ад неўтаймаванасці да смутку, ад смутку да рахманасці і раўнавагі.* (А. Разанаў);

4) ‘выконваць дзеянне так, як у тым, што названа ўтваральнай асновай’: ***пеклавацца*** ‘выконваць дзеянне так, як у пекле’: *Вось і **пяклуйся** на слупе з гняздом* [пра бусла] *– / Глядзіш, так-сяк і пераб’ешся з дзецьмі.* (В. Зуёнак); *Калі пацееш ты ля ворыва, / Дык ён* [Мефістофіль] ***пяклуецца** ля варыва...* (В. Зуёнак). Лексема ***пеклавацца*** адзначана два разы;

5) ‘ператварацца ў тое, што абазначана ўтваральнай асновай’: ***скарбавацца*** ‘ператварацца ў скарб’: *Няможна патураць тузе, / Каб яву засланіла зданню, / Каб зрабавала пакрысе, / Што **скарбавалася** гадамі* (Н. Мацяш).

МГПУ им. И.П. Шамякина

Такім чынам, з фармантам *-ава-цца* зафіксавана 5 індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў. Утваральныя асновы па колькасці складоў амаль аднолькавыя: аднаскладовыя (4), двухскладовая (1). Яны з'яўляюцца назвамі матэрыялаў, рэчываў, абстрактных паняццяў. Утваральныя асновы ў двух словатворах захоўваюцца без змен: *пекла – пеклавацца, скарб – скарбавацца.* У іншых утваральных асновах адбылося чаргаванне: *[о]* з *[ø] (васілёк – васількаваць, халадок – халадкаваць), [о]* з *[а] (шоўк – шаўкавацца), [о]* з *[э] (мёд – медавацца).* Ва ўсіх суадносных парах націск перамяшчаецца на другі суфіксальны склад.

**Вывады**

Такім чынам, у мове сучаснай беларускай паэзіі зафіксавана 77 індывідуальна-аўтарскіх суфіксальна-постфіксальных дзеясловаў, у тым ліку з фармантам *-і-цца (-ы-цца)* – 71, *-ава-цца* – 5. З фармантам *-е-цца* словатворы не адзначаны. Пераважная большасць неалагізмаў утворана ад асноў назоўніка (62), астатнія (14) матывуюцца прыметнікамі. Утваральныя асновы адна-, двух-трох- і чатырохскладовыя (адпаведна 34, 36, 5 і 1). Перад фармантам *-і-цца* ўжываюцца мяккія *б', в', дз', л', м', н', с', ц', й*, перад варыянтам *-ы-цца* – зацвярдзелыя *ж, р, ч.* Іншы раз утваральныя асновы скарачаюцца *(снягур/к/а – снягурыцца).* Націск у дэрыватах з фармантам *-і-цца* застаецца пераважна на ўтваральнай аснове *(нашча́дак – нашча́дзіцца)* або пераходзіць на аснову з канчатка *(лубяны́ – лубя́ніцца)*, радзей, у асноўным з аднаскладовай асновы, пераходзіць з асновы або з канчатка на суфікс *(лі́сце – лісці́цца, вярба́ – вярбі́цца).* Ва ўсіх суадносных парах з фармантам *-ава-цца* націск перамяшчаецца на суфікс *(скарб – скарбава́цца).*

Прадуктыўнасць індывідуальна-аўтарскіх дзеясловаў з фармантам *-і-цца (-ы-цца)*, як і суфіксальных дзеяслоўных утварэнняў, тлумачыцца вялікімі патэнцыяльнымі магчымасцямі іменных лексіка-граматычных груп, што з'яўляюцца словаўтваральнай базай пры дэрывацыі лексічных адзінак са значэннем працэсуальнасці. Як і суфікс *-і- (-ы-)*, фармант *-і-цца (-ы-цца)* лёгка далучаецца да асноў назоўнікаў, не ведаючы ні марфаналагічных, ні семантычных перашкод [6, 198].

Прааналізаваныя дзеясловы адзначаюцца ў мове паэтычных твораў 27-і аўтараў. Да іх утварэння часцей за іншых звярталіся Р. Барадулін (18 слоў), В. Зуёнак (12), К. Камейша (10), А. Разанаў (4).

***Літаратура***

1. Беларуская граматыка : у 2 ч. / рэд.: М. В. Бірылы, П. П. Шуба ; АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1 : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 431 с.

2. Шуба, П. П. Сучасная беларуская мова: марфаналогія, марфалогія : вучэб. дапаможнік для філал. фак. ун-таў / П. П. Шуба. – Мінск : Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

3. Антанюк, Л. А. Словаўтварэнне / Л. А. Антанюк // Беларуская мова: лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск : Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – С. 307–440.

4. Шабовіч, М. В. Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гг. XX ст. : дыс… канд. філал. навук : 10.02.01 / М. В. Шабовіч ; НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск, 2004. – 117 л.

5. Васілеўскі, М. С. Дзеяслоўнае словаўтварэнне: адыменныя суфіксальныя лексемы / М. С. Васілеўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 248 с.

6. Солахаў, А. В. Аўтарскія (акзіянальныя) дзеясловы з суфіксам *-і- (-ы-)* ў мове беларускай паэзіі другой паловы XX стагоддзя / А. В. Солахаў // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. Лингвистика. – 2008. – № 1. – С. 194–198.

***Summary***

The article deals with verbs, formed in the suffixal-postfixal way. These verbs are analyzed on the basis of a rich actual material (76 words) from texts of the individual author's. The article also reflets their efficiency, the changes which have occured in word-building.

*Паступіў у рэдакцыю 28.01.09.*

МГПУ им. И.П.Шамякина